Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №6(57), 2009

*УДК 001 8+37*

# Цуда кітайскага бамбуку, або як дасягнуць аптымальнай самарэалізацыі ў жыцці і прафесійнай дзейнасці

М. С. Кавалевіч

У артыкуле прапанавана мадэль арганізацыі жыццёвага прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў, якая садзейнічае: рэалізацыі асобасных патрэб праз пастаноўку мэтаў і вызначэнне прыярытэтаў; мае на ўвазе адказнасць за вынікі; выкарыстанню сінергіі аддаленых, сярэдніх і блізкіх перспектыў; асобаснаму росту; прыўнясенню парадку ў жыццё праз уменне планаваць час і кіраваць сабою; адаптацыі да зменлівых умоў жыцця; змяншае адмоўныя стрэсавыя вынікі знаходжання ў пункце біфуркацыі за кошт збалансіроўкі сацыяльных роляў.

***Уводзіны.*** Кітайскі бамбук сеюць у падрыхтаваную глебу і першыя 4 гады яго рост адбываецца пад зямлёй, над паверхняй відаць толькі маленькая цыбулінка, з якой прабіваецца тонкі расток. А потым на працягу пятага года жыцця бамбук дасягае каля 2,5 м. Для педагога гэта метафара зразумела – шмат часу трэба страціць для таго, каб падрыхтаваць падрастаючага чалавека для самастойнага жыцця, для самастойнага асобаснага і прафесійнага выбару, але ў канечным выніку нас чакае багаты ўраджай у выглядзе аптымальнай самарэалізацыі.

Для эфектыўнай арганізацыі жыцця неабходна рэалізацыя чатырох фундаментальных чалавечых патрэб і здольнасцяў: жыць, любіць, вучыцца і пакінуць след. Патрэба жыць – гэта наша фізічная патрэба ў харчаванні, адзенні, эканамічным дастатку, здароўі. Патрэба любіць – гэта наша сацыяльная патрэба ў зносінах з людзьмі. Патрэба вучыцца – гэта інтэлектуальная патрэба ў развіцці і асобасным росце, а патрэба пакінуць свой след на зямлі – гэта духоўная патрэба, адчуваць сэнс жыцця, сваё прызначэнне і свой уклад у грамадства.

В. Франкл, аўстрыйскі псіхолаг, перажыўшы нацысцкія лагеры смерці, зрабіў важнае адкрыццё: найважнейшым фактарам, які дапамагаў выжыць, было *пачуццё перспектывы* – перакананасць у тым, што трэба выжыць, каб рэалізаваць сваё чалавечае прызначэнне [4].

Сваю канцэпцыю жыцця С.Л. Рубінштэйн сфармуляваў так: “Толькі тое жыццё з’яўляецца сапраўдным, якое здзяйсняецца, будуецца самім чалавекам… Чалавек становіцца суб’ектам і ў тым сэнсе, што ён выпрацоўвае спосаб рашэння жыццёвых супрацьлегласцяў, усведамляючы сваю адказнасць перад сабою і людзьмі за вынікі такога рашэння” [3, с. 351]. Вялікую ролю ў пабудове ўласнага жыццёвай прафесійнай перспектывы мае адказнасць як увасабленне прынцыповых адносін да жыцця. Яна праяўляецца ў свабодзе выбару, у асэнсаванні права на яго і здольнасці адстаяць гэты выбар.

Сутнасць педагагічнай падтрымкі заключаецца ў тым, каб паказаць асобе, якая самавызначаецца, усё багацце жыцця, шчасце ўласнай найбольш поўнай самарэалізацыі нават у цяжкіх умовах. Педагагічная падтрымка – гэта барацьба за вышэйшы ўзровень чалавечага існавання, за вяршыню чалавечага быцця. “Будаўніцтва вышэйшых узроўняў чалавечага жыцця ёсць барацьба супраць усяго, што зніжае ўзровень чалавека” [3, с. 346]. Такім чынам, жыццёвы шлях – гэта не толькі рух чалавека наперад, але і рух наверх, да вышэйшых, больш дасканалых формаў, да лепшых праяўленняў чалавечай сутнасці, дасягнення асобаснай дасканаласці. А асоба ў якасці суб’екта жыцця выступае як яго арганізатар, фарміруе пазіцыю і “лінію свайго жыцця” паводле свайго праекта, у адпаведнасці са сваімі схільнасцямі, імкненнямі, стылем жыцця. Чым больш чалавек прадумвае, асэнсоўвае сваё жыццё, чым больш ён імкнецца яго арганізаваць, вызначыць напрамак, тым больш унікальным, каштоўным, творчым яно становіцца.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У розных людзей выяўляецца розная мера цэласнасці жыццёвага шляху і розная ступень адпаведнасці дзеянняў асобы яе каштоўнасцям і намерам. Ужо ў жыццёвых планах юнакоў, па дадзеных нашага даследавання, будучае бачыцца па-рознаму: у адных – у шчаслівым сямейным жыцці, у другіх – у прафесійнай кар’еры, творчым характары працы, у трэціх – у магчымасці зарабляць вялікія грошы, чацвёртыя мараць прынесці як мага больш карысці людзям; стратэгія адных у найбольш поўным прымяненні свайго таленту, стратэгія другіх – у атрыманні максімума даброт за свой талент.

*Прадмет даследавання* – мадэль арганізацыі жыццёвага прафесійнага самавызначэння і самарэалізацыі старшакласнікаў.

*Мэта даследавання* – распрацаваць мадэль арганізацыі жыццёвага прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў.

*Метады даследавання* – сістэмны аналіз філасофскай, педагагічнай, псіхалагічнай літаратуры, мадэляванне, метады сістэматызацыі, абагульнення і інтэрпрэтацыі вынікаў даследавання.

### *Планаванне жыцця як важны сродак разумнай і прадуктыўнай арганізацыі чалавечага жыцця*

Даследаваннямі ўстаноўлена, што тыя ці іншыя чаканні і ўяўленні аб будучым уздзейнічаюць на паводзіны чалавека ў цяперашні час і перажыванне ім сваёй сучаснасці: станоўчыя чаканні ў адносінах да будучыні надаюць сучаснасці каштоўнасць, негатыўныя – абясцэньваюць яе. Псіхалагічнае будучае існуе як праект, яго функцыя – у забеспячэнні сэнсавай і часавай перспектывы. Наяўнасць часавай перспектывы звязана з актыўнасцю асобы і прадуктыўнасцю яе дзейнасці ў цяперашні час. Адсутнасць або абмежаванасць перспектывы вядзе да пасіўнасці, дэзарганізацыі, неэфектыўнасці дзейнасці [2, с. 61]. З аднаго боку, паспяховае самаразвіццё асобы ў цяперашні час напаўняе будучыню сэнсам, структуруе яе, а чалавек становіцца суб’ектам уласнай дзейнасці. Калі ж развіццё па нейкіх прычынах запавольваецца, будучыня ўспрымаецца як бяссэнсавая, неструктураваная, а чалавек цалкам залежыць ад знешніх уздзеянняў.

Планаванне жыцця чалавекам ва ўмовах дэфіцыту часу з’яўляецца важным сродкам разумнай і прадуктыўнай арганізацыі чалавечага жыцця. Станоўчыя адносіны да планавання ўпарадкоўваюць будучыню, яна ўяўляецца як паслядоўнасць у дасягненні канкрэтных мэтаў, якія вядуць да агульнай мэты жыцця. У выпадку негатыўных адносін да планавання і адсутнасці жыццёвых прафесійных планаў будучае фактычна не прагназуецца, не структуруецца. Пад структураванасцю будучыні разумеюць адносіны да планавання ўласнага жыцця. Пры станоўчых адносінах да планавання будучыня з’яўляецца структураванай, пры адмоўных – аморфнай.

Выступіўшы ў ролі суб’ектаў арганізацыі ўласнага часу, старшакласнікі могуць своечасова з улікам індывідуальных магчымасцяў, планаў, перспектыў і грамадскіх патрабаванняў здзейсніць уласнае жыццёвае прафесійнае самавызначэнне. Час можа выступаць рухальнай сілай развіцця асобы, калі ў яе развітыя якасці суб’екта часу і тормазам развіцця, калі такія якасці не развітыя. “Стратэгія “апярэджвання” рэальнага (храналагічнага) часу, планавання сваіх дзеянняў “наперад”, з’яўляецца стратэгіяй пераўтварэння часу ва ўмову развіцця, рэалізацыі сваіх задач. Стратэгія “актыўнага ігнаравання” нарматываў часу ў выніку прыводзіць да безнадзейнага адставання, да прафесійнай і асобаснай некампетэнтнасці…”[1, с. 130]. Таму своечасовасць з’яўляецца неад’емнай якасцю суб’екта працы і прафесійнай дзейнасці. Своечасовасць як паўсядзённая практыка павінна стаць спосабам жыцця ўжо ў школьныя гады, вызначаць стратэгію жыцця, стратэгію “апярэджвання” храналагічнага часу. Старшакласнікаў трэба вучыць выкарыстоўваць свае часавыя псіхічныя здольнасці і механізмы, развіваць часавую скіраванасць дзейнасці.

Індывідуальную здольнасць да рэгуляцыі часу мы будзем разглядаць як здольнасць да планавання ўласнай жыццёвай прафесійнай перспектывы. Пры гэтым “псіхічная рэгуляцыя выступае сродкам вырашэння задачы рэгуляцыі дзейнасці” [1, с. 135]. У плане нашага даследавання рэгулятыўны складнік прафесійнай самасвядомасці – сродак вырашэння задач прафесійнага самавызначэння. “Аптымальная форма праяўлення здольнасці да рэгуляцыі часу –

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гэта арганізацыя жыцця як адзінага цэлага, самастойнае вызначэнне жыццёвых перыядаў, фаз, заняткаў, іх паслядоўнасці і сэнсавай іерархіі" [1, с. 133].

Пашырэнне часавых магчымасцяў асобы звязана з жыццёвым вопытам, развіццём здольнасцяў і ўменняў, якія паскараюць дзейнасць. Развіваецца здольнасць да асобаснай арганізацыі часу. Гэта магчыма толькі калі асобаснае і прафесійнае самавызначэнне з'яўляюцца адэкватнымі, а выбар ажыццяўляецца на карысць асобаснага росту. Неадэкватнае прафесійнае самавызначэнне – гэта знішчэнне каштоўнасцяў і страта часу.

Каштоўнасныя адносіны да жыцця праяўляюцца ў імкненні асобы да самаўдасканалення, рэалізацыі сваіх магчымасцяў у грамадска каштоўных сферах дзейнасці, пашырэнні індывідуальных укладанняў у грамадства, каштоўнасць якіх не змяншаецца з цягам часу. Калі ж прафесійная дзейнасць не з'яўляецца каштоўнасцю асобы, адбываецца абясцэньванне асобаснага часу. Асоба здольная аптымальна выкарыстаць час, напоўніць яго сэнсам. Актыўнасць асобы павялічвае яе часавыя магчымасці, садзейнічае больш поўнай самарэалізацыі, адэкватнаму самавызначэнню, узрастае каштоўнасць рэальнага часу жыцця.

Адэкватнае прафесійнае самавызначэнне садзейнічае павелічэнню "прадуктыўнасці" жыцця (К.А. Абульханава-Слаўская). Гэтыя рэзервы часу асоба выкарыстоўвае для самаразвіцця і аказваецца здольнай павялічыць час жыцця, памножыць сацыяльны час на часавы патэнцыял свайго развіцця. Асоба праводзіць сваю "лінію жыцця", вырашае асноўную задачу жыцця, знаходзіць сэнс, забяспечвае сэнсавую сувязь паміж мінулым, сучасным і будучым.

Наша даследаванне паказала, што, з'яўляючыся псіхалагічна прывабным для старшакласнікаў, прафесійнае будучае не заўсёды з'яўляецца асобасна перспектыўным. Прычына бачыцца ў неакрэсленасці асноў для выбару прафесіі, няведанні сваіх асобасных якасцяў, здольнасцяў, цяжкасцяў паступлення ў ВНУ, г.зн. незалежнасці будучыні ад асобы, яе нявызначанасці.

Улічваючы, што жыццёвая перспектыва падлеткаў і юнакоў пакуль абмежавана, трэба беражліва адносіцца да іх псіхалагічнай перспектывы, развіваць веру ва ўласныя магчымасці самавызначэння і самарэалізацыі. Прафесійнае самавызначэнне, яго характар (творчы або падпарадкаваны) акрэсліваюць жыццёвыя перспектывы асобы. Педагагічная падтрымка павінна быць скіравана на дапамогу асобе ў пошуку аптымальнай жыццёвай пазіцыі, што адкрывае жыццёвыя прафесійныя перспектывы.

Перспектыва, уяўленне пра будучыню – галоўная рухальная сіла чалавечай дзейнасці, магчымасць стаць тым, чым чалавек яшчэ не з'яўляецца, але можа стаць. Уяўленне пра будучыню і сябе ў гэтай будучыні ўплывае на тыя рашэнні, якія мы прымаем у момант выбару.

Сцэнарыі, напісаныя нам іншымі людзьмі, перашкаджаюць нам быць тымі, хто мы ёсць на самой справе. А калі выбар і перспектыва, якая адкрываецца ў выніку яго ажыццяўлення, заснаваны на вышэйшых чалавечых і асобасных каштоўнасцях, разуменне таго ўкладу, які чалавек можа ўнесці, спадчыннасці, якую ён можа пакінуць, то забяспечваецца асобасны і прафесійны рост, вялікае імкненне да больш высокага, чым уласнае "эга", пашыраюцца гарызонты магчымага. Перспектыва набывае натхнёны характар.

Арганізуючы падтрымку старшакласнікаў у іх прафесійным самавызначэнні, трэба мець на ўвазе, што прафесійныя ролі цесна ўзаемазвязаны з іншымі сацыяльнымі ролямі, яны ўяўляюць "жывую экасістэму", дзе кожная ўплывае на ўсе астатнія. Жыццё – непадзельнае цэлае, усе ролі там павінны быць збалансаванымі. Трэба імкнуцца да сінергіі сацыяльных роляў, якая дапамагае эканоміць час і сілы для прыняцця рашэння. Так прынцып прыняцця на сябе адказнасці за свой выбар аднолькава эфектыўны і ў прафесійным, і ў асабістым самавызначэнні. Выбар прафесіі, як выбар кірунку ўнясення ўкладу ў развіццё грамадства і ўласнае развіццё – найбольш спрыяльны і дастойны выбар. Ён правільны, бо ўзгоднены з асобаснымі каштоўнасцямі і перакананнямі.

Кожная прафесійная і жыццёвая роля ўтрымлівае наступныя вымярэнні: духоўнае (звязанае з жыццёвымі сэнсамі і прызначэннем), сацыяльнае (мае на ўвазе зносіны (прамыя або ўскосныя) і інтэлектуальнае вымярэнне (патрабуе навучання), фізічнае здароўе чалавека.

Устойлівы *першасны баланс* прафесійных і жыццёвых роляў забяспечвае ўнутраную раўнавагу паміж фізічным, сацыяльным, інтэлектуальным і духоўным развіццём асобы, якая

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

самавызначаецца. Не можа быць балансу ў жыцці без сінергіі, без балансу ва ўнутраным свеце чалавека.

*Другасны баланс* заключаецца ў нашых ролях. Гэта сінергічны баланс, які можа чаргавацца з часовым дысбалансам, і дасягаецца, калі часткі ўзаемадзейнічаюць і спараджаюць нешта большае чым сума частак, цэлае. Важна дасягнуць сінергіі пастаўленых мэтаў і сацыяльных роляў. Камбінуючы некаторыя справы, можна дабівацца пры іх сумленным выкананні большых эфектаў, сінергіі ў жыцці. Трэба навучыцца з дапамогай творчага ўяўлення сінергетычна ажыццяўляць планы і задумы. Так нашы ўклады ва ўласнае здароўе ствараюць неабходныя прадпасылкі для паспяховай прафесійнай дзейнасці. Любімая работа забяспечвае псіхічнае і фізічнае здароўе, асабісты станоўчы настрой.

Планаванне, расстаноўка прыярытэтаў уносіць у наша жыццё ўпарадкаванасць. Поспех у прафесійным і асобасным жыцці – гэта вынік прадуманага планавання і падрыхтоўкі для сінергічнага выканання сацыяльных роляў і прыняцце адказнасці за гэта выкананне. Калі запланаванае здзяйсняецца, мы дасягаем эфектыўнасці ў прафесійным і асобасным жыцці. Але, калі сітуацыя мяняецца, то час, страчаны на падрыхтоўку, дазваляе нам эфектыўна прааналізаваць сітуацыю і працягваць рух у правільным кірунку. Наяўнасць жыццёвых перспектыў дазваляе прымаць мудрыя і эфектыўныя рашэнні ў момант выбару.

Усе бакі нашага жыцця важныя для рэалізацыі прызначэння, а сінергія паміж імі павышае энергію цэлага – магчымасцяў чалавека. Але нават пры самай эфектыўнай арганізацыі жыццёвага і прафесійнага самавызначэння планаванне нельга ажыццявіць дэталёва, усебакова кантраляваць будучыню. Могуць адбыцца неспадзяваныя падзеі, уплыў якіх на наша жыццё ўвогуле і прафесійны выбар у прыватнасці кантраляваць не ўяўляецца магчымым. Гэта не абазначаная на карце тэрыторыя. І здольнасць да перамяшчэння па гэтай тэрыторыі залежыць ад пераканнняў, ад ступені сфарміраванасці каштоўнасных арыентацый і жыццёвых сэнсаў. У чалавека павінна быць магчымасць рухацца ў адпаведнасці з гэтым унутраным компасам.

Момант выбару – гэта момант ісціны. Гэта экзамен нашага характару і кампетэнтнасці. Фактарамі, што ўплываюць на жыццёвы і прафесійны выбар, з'яўляюцца перш за ўсё нашы глыбінныя каштоўнасці, сумленнасць, фундаментальныя патрэбы, жаданні, інтарэсы, схільнасці і здольнасці.

У чалавека заўсёды ёсць магчымасць выбіраць сваю пазіцыю ў любых абставінах, выбіраць свой уласны шлях. Мы самі адказны за свой выбар. Ланцужок выбару вядзе да нашага лёсу. Выбар – не абавязковы працяг лінейнага мыслення, часцей гэта глыбіннае разуменне таго, што гэта правільна і перакананасць у тым, што гэта правільнае прынясе якасныя вынікі. Гэта выпадковы выбар, але ён гарманіруе з нашымі каштоўнаснымі арыентацыямі, якія выступаюць у якасці атрактару. Гэта маментальнае азарэнне імгненна скіроўвае нас на эфектыўнае рашэнне, якое гарманіруе з нашай самасвядомасцю, сумленнасцю і воляй, творчым мысленнем. Ва ўзаемасувязі яны і забяспечваюць максімальную эфектыўнасць рэалізацыі выбару. Ажыццяўленне выбару патрабуе мужнасці і ўпэўненасці ў сабе, веры ва ўласныя сілы і магчымасці, а не спадзявання на шанц або ўплывовых сваякоў. Мэтазгодна перад першасным выбарам зрабіць паўзу і звярнуцца да ўласнай сумленнасці, што дапаможа зрабіць беспамылковы выбар, які заснаваны на сінергіі сэрца і розуму. Гэта дасць магчымасць зберагчы цэласнасць уласнай асобы ў момант выбару.

Сінергетычны падыход дае магчымасць улічваць унікальнасць кожнага чалавека і багаты патэнцыял сінергетычных трэціх альтэрнатыў, значна пераўзысці тое, што чалавек можа прыдумаць адзін. Сінергетычны падыход – гэта багацце ўзаемаадносін, дзівосныя адкрыцці, спантаннасць і захапляльнасць, глыбокае задавальненне, радасць сумеснага стварэння таго, што раней не існавала. Праз аб'яднанне энергіі педагога і вучня, іх талентаў і імкненняў у адзіны тэмпасвет можна перамясціць пункт апоры ў зону самаарганізацыі, забяспечыўшы рост творчасці і эфектыўнасці працэсаў жыццёвага прафесійнага выбару. Пры гэтым трэба памятаць: свет, у якім мы жывем, з'яўляецца спадчынай тых, хто жыў да нас, і тыя рашэнні, якія мы прымаем, пакідаюць свой след для тых, хто будзе жыць пасля нас. Таму незалежнасць, свабода, індывідуальнасць не самамэта, а сродак эфектыўнай самарэалізацыі на карысць асобаснага росту і грамадскай эфектыўнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Незалежныя дасягненні – гэта ракавая пухліна, самай страшнай асаблівасцю якой з'яўляецца тое, што яна клапоціцца толькі пра сябе. Яна высмоктвае сокі з прытуліўшай яе тканкі, пакуль не знішчыць гэтую тканку, і тым самым ажыццяўляе біялагічнае самазабойства, паколькі ракавая клетка не можа жыць па-за арганізмам, у якім пачынаецца яе бязлітаснае эгацэнтрычнае развіццё. Праблемы ўзнікаюць, калі рашэнне прымае чалавек, якому не хапае кампетэнтнасці і характару, каб узаемадзейнічаць сінергетычным, пазітыўным чынам з іншымі людзьмі. Такі чалавек жыве па сваім сцэнарыі, і калі гэты сцэнарый не абапіраецца на агульначалавечыя каштоўнасці, ён пастунова палярызуецца і з цягам часу вядзе да агрэсіўнасці, азлобленасці.

Калі педагог і вучні абапіраюцца на агульныя прынцыпы, то іх розныя погляды не перашкаджаюць рухацца разам, імкнуцца знайсці сінергетычную трэцюю альтэрнатыву, якая максімальна задавальняе і вучня, і педагога. Недахопы, праблемы вучня педагог успрымае як повад дапамагчы яму. Іх цікавіць не тое, хто праў, а *як правільна.*

Таму *парадыгму незалежнасці трэба змяніць на парадыгму ўзаемазалежнасці.*

Толькі выкарыстанне агульнай інтэлектуальнай магутнасці народа дазволіць пераадолець усе цяжкасці і "выклікі сучаснасці" і пабудаваць суверэнную квітнеючую Беларусь. Вобразна кажучы, каб працэс самавызначэння асобы быў паспяховым, трэба "не зрываць лісце, а працаваць над узаемазалежнымі каранямі".

Сінергетычнае ўзаемадзеянне – гэта істотна новае ўзаемадзеянне, заснаванае на канцэпцыі збалансаванага падбору прынцыпаў і ідэй, якія натхняюць, але адначасова і палохаюць. Уключыўшыся ў сінергетычнае ўзаемадзеянне, мы ніколі не ведаем, чым яно скончыцца, пакідаем спакойную гавань і становімся ўразлівымі. Жыццё становіцца сапраўднай прыгодай. Мы не ведаем, што чакае нас за паваротам. Мы пакідаем "зону камфорту", рызыкуем. Але трэба самастойна зрабіць першы крок. Тут патрэбна мужнасць і смеласць, сумленнасць, воля, творчае мысленне, якія знаходзяцца ва ўзаемазалежнасці і забяспечваюць поспех жыццёвага і прафесійнага выбару.

Самасвядомасць дазваляе асобе пазнаць сябе, прыслухацца да сябе. Апора на жыццёвыя прынцыпы дае ёй магчымасць у аснове сваёй не мяняцца і быць гатовай змяняцца, калі патрабуюць абставіны і час. Пры гэтым праблемы, якія ўзнікаюць у працэсе прафесійнага выбару, і слабасці вучняў – повад дапамагчы ім, аказаць педагагічную падтрымку.

Сумленнасць дае магчымасць зразумець, што значыць быць часткай калектыўнай сумленнасці. Сумленнасць дапамагае педагогу ўсвядоміць, што і вучні могуць мець пэўныя веды, сцэнарыі, якія заслугоўваюць увагі.

Незалежная воля можа быць выкарыстана для набыцця залежнай волі, узаемазалежных намаганняў, для дасягнення мэты.

Творчая сінергія – гэта сіла альтэрнатыўных, сумесных рашэнняў, якія аказваюцца больш канструктыўнымі, чым прынятыя паасобку.

У сінергетычным кантэксце супрацоўніцтва заўсёды эфектыўней спаборніцтва. Мы пачынаем думаць пра інтарэсы людзей і грамадства ў цэлым, а гэта і ёсць наш выбар.

Сінергія – плод мыслення ў напрамку двухбаковай перамогі і імкнення зразумець іншага. Для педагога карысна прытрымлівацца правіла: спачатку пастарайся зразумець вучня, потым – быць зразумелым ім. Эмпатыя – аснова сінергіі. Але ж *сінергія – гэта не кампраміс, а пошук трэцяй альтэрнатывы.*

Педагогу трэба імкнуцца да сінергіі. А для гэтага неабходна сфарміраваць агульную перспектыву, сінергічныя мэты і ролі. Такі падыход заснаваны на культуры ўзаемнага даверу і ўзаемадапамогі. Сінергетычны эфект будзе забяспечаны, калі агульная формула прызвання:

- грунтуецца на грамадска карысных мэтах асобаснага росту;
- базіруецца на вечных агульначалавечых каштоўнасцях;
- утрымлівае перспектыву;
- улічвае патрэбы, інтарэсы, схільнасці і здольнасці асобы і патрэбы грамадства.

У працэсе вызначэння жыццёвых мэтаў трэба ўлічваюцца грамадскія мэты і агульначалавечыя каштоўнасці. Гэта дазваляе гарманізаваць мэты канкрэтнага чалавека і грамадскія

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мэты. Калі людзі думаюць і дзейнічаюць у напрамку ўзаемнай перамогі, імкнуцца зразумець адзін аднаго, скіроўваюць сваю энергію на сінергетычнае вырашэнне праблемы, эфект аказваецца грандыёзным.

Падыход "перамога/перамога" – гэта пераход ад спаборніцтва да сінергіі, гэта ўкараненне культуры высокага даверу. Унутраная матывацыя, скіраваная на рэалізацыю агульнай перспектывы, сінергетычнае спалучэнне асобаснага прызвання і грамадскіх патрэб з'яўляецца абавязковай умовай паспяховай прафесійнай самарэалізацыі. Без культуры сінергетычны эфект немагчымы. Таму на месца канкурэнцыі павінна прыйсці супрацоўніцтва. Неабходна планаваць, дзейнічаць, ацэньваць, развіваць здольнасць да самаарганізацыі, зберагаючы адказнасць за вынікі прынятых рашэнняў і дапамагаючы дасягнуць гэтых вынікаў асобе, якая самавызначаецца. Сінергія – узаемная перамога, а не канкурэнцыя.

***У чым цуда кітайскага бамбуку?***

Цуда кітайскага бамбуку сведчыць: шмат часу пройдзе пакуль з маленькай цыбулінкі вырасце велізарнае і здаровае дрэва, шмат сіл і часу трэба страціць для таго, каб падрыхтаваць падрастаючага чалавека для самастойнага жыцця, для самастойнага асобаснага і прафесійнага выбару, але ў канечным выніку нас чакае багаты ўраджай у выглядзе аптымальнай самарэалізацыі ў жыцці і прафесіі.

Культура высокага даверу, якая мабілізуе асобу, садзейнічае пашырэнню свабоды выбару, яго актывізацыі. Такая падрыхтоўка патрабуе часу. Але толькі ў гармоніі з высокамаральнымі прынцыпамі і агульначалавечымі каштоўнасцямі; праяўляючы цярплівасць, мужнасць, параіўшыся са сваім сумленнем, асоба можа ажыццявіць сапраўдны выбар на паваротных этапах жыцця.

Выбар – гэта цяжкая задача. Але яна павінна ўспрымацца як магчымасць росту і самаўдасканалення. Удасканальваючы сябе, мы ўдасканальваем грамадства, бо мы яго часцінкі. Удасканальваючы сябе і грамадства, мы садзейнічаем пераўтварэнню хаосу ў парадак і пры гэтым набываем упэўненасць у сваіх сілах. Ажыццявіць задуманае можна будучы ўпэўненым, што мы зможам выканаць тыя сацыяльныя ролі, якія выбралі, бо яны не канкурэнты, а часткі сінергічнага жывога цэлага, якое называецца жыццё.

Кропка біфуркацыі на нашым жыццёвым шляху – гэта паўза, якую можна выкарыстаць, каб прыслухацца да ўласнай сумленнасці, сваіх жыццёвых прынцыпаў і абапіраючыся на агульначалавечыя каштоўнасці, зрабіць найлепшы выбар.

Роля педагога ў настройцы асобы, якая шукае свой шлях у жыцці, скіраванні энергіі і сумесных намаганняў на дастойныя мэты, якія аптымальна будуць садзейнічаць асобаснаму росту, самаўдасканаленню і грамадскаму росквіту.

Жыццёвы прафесійны выбар – гэта:

- усведамленне галоўнай мэты і сэнсу жыцця, сувязь іх з прызначэннем;
- аналіз сацыяльных роляў з мэтай вызначэння шляхоў, па якіх можна сінергетычна і збалансавана займацца падрыхтоўкай да рэалізацыі жыццёвых прафесійных планаў;
- вызначэнне мэтаў (стратэгічных, тактычных і аператыўных) і іх гарманізацыя;
- пошук сродкаў для рэалізацыі запланаваных мэтаў;
- ацэнка вынікаў зробленага выбару як этапу на шляху прафесійнага станаўлення.

Мадэль арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў, пабудаваная ў адпаведнасці з агульнай формулай прызвання, эксперыментальна апрабіравана ў ліцэі №1 і гімназіі №2 г. Брэста.

У якасці ўмоў эфектыўнага жыццёвага прафесійнага самавызначэння вылучаны:

➢ вызначэнне жыццёвых мэтаў і сэнсу, расстаноўка прыярытэтаў;

➢ сувязь прафесійнага выбару з каштоўнаснымі арыентацыямі асобы і патрэбамі грамадства ( сіла перспектывы);

➢ сувязь аддаленых, сярэдніх і блізкіх перспектыў (сіла мэтаў);

➢ баланс сацыяльных роляў, сінергія асобаснага і прафесійнага самавызначэння (сіла балансу);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- сінергія фізічных, сацыяльных, інтэлектуальных патрэб (сіла балансу патрэб);
- штодзённае суаднясенне планаў з мэтамі і каштоўнасцямі (сіла перспектывы).

Прапанаваная мадэль арганізацыя жыццёвага прафесійнага самавызначэння садзейнічае: рэалізацыі асобасных патрэб праз пастаноўку мэтаў і вызначэнне прыярытэтаў; мае на ўвазе адказнасць за вынікі; выкарыстанню сінергіі аддаленых, сярэдніх і блізкіх перспектыў; асобаснаму росту; прыўнясенню парадку ў жыццё праз уменне планаваць час і кіраваць сабою; адаптацыі да зменлівых умоў жыцця; змяншае адмоўныя стрэсавыя вынікі знаходжання ў кропцы біфуркацыі за кошт збалансіроўкі сацыяльных роляў. Пры гэтым прыярытэт аддаецца доўгатэрміновым мэтам, якім падпарадкоўваюцца сярэдне- і блізкатэрміновыя.

Праблемы, што ўзнікаюць у працэсе кіраўніцтва працэсам прафесійнага выбару – станоўчыя магчымасці для педагагічнага ўздзеяння, здольнасць супрацоўнічаць з вучнямі. Мэтазгодна падрыхтаваць вучняў на магчымасць змены абставін пры ажыццяўленні планаў, бо жыццё – гэта дзівосныя прыгода, падарожжа, у якое мы адпраўляемся з компасам у руках і якое дазваляе нам арыентавацца на тэрыторыі, якая яшчэ не нанесена на карту. Перашкоды, супрацьлегласці – натуральная частка нашага жыцця. Трэба навучыцца сінергіі выкарыстання агульначалавечых магчымасцяў для стварэння альтэрнатыўных варыянтаў выбару. Пры гэтым педагог павінен забяспечыць не столькі кантроль, колькі параду, кансультацыю і сінергію. Трэба вучыцца дзейнічаць сінергічна ў стратэгічных пытаннях жыццёвага выбару.

Мяркую, што асоба можа знаходзіцца ў сітуацыі ўстойлівай раўнавагі, калі ў працэсе жыццёвага прафесійнага самавызначэння яна абапіраецца на два галоўныя прыярытэты: асобасную сумленнасць і ўклад у грамадскую справу. Усе чалавечыя патрэбы важныя, але менавіта ўклад і сумленнасць надаюць сэнс ім усім і напаўняюць іх энергіяй. Большасць мэтаў парадыгмы незалежных індывідуальных дасягненняў пустыя, па-за кантэкстам грамадскіх мэтаў яны ілюзорныя. Толькі, калі асоба, што самавызначаецца, арыентуецца на ўклад у грамадскую справу, а не на спажыванне, можна гаварыць аб стане раўнавагі і парадку ва ўсіх аспектах асобаснага і прафесійнага жыцця.

Кожнае прынятае рашэнне – важнае рашэнне. Некаторыя рашэнні становяцца паваротным момантам у нашым жыцці. Парою яны даюцца цяжка, патрабуюць змяніць пункт гледжання. Парою мы рызыкуем. Трэба толькі верыць у вялікую сілу прынцыпаў сінергетычнай узаемазалежнасці – крыніцу сапраўднага асобаснага росту. Не баяцца пакінуць зону камфорту. Пры гэтым трэба мець на ўвазе: *дастойных мэтаў нельга дасягнуць недастойнымі сродкамі*. Выбар, які робіць чалавек, заўсёды жыццёва важны. Ажыццяўляючы яго, трэба прыслухацца да свайго сумлення, каб можна было радавацца вынікам, а не баяцца іх. Час трэба не "страчваць", а "інвесціраваць" у важныя справы, пашыраць свае магчымасці. Толькі ва ўзаемадзеянні з іншымі людзьмі можна вырашыць тыя праблемы, якія нас чакаюць у жыцці. Толькі развіваючы ўменне слухаць голас сумлення, уменне эфектыўна планаваць сваё жыццё, мы можам унесці дастойны ўклад у развіццё грамадства.

***Заключэнне.*** У выніку даследавання ўпершыню тэарэтычна абгрунтавана і рэалізавана ў эксперыментальнай практыцы мадэль арганізацыі жыццёвага прафесійнага самавызначэння і самарэалізацыі старшакласнікаў.

У адрозненне ад вядомых мадэляў прафарыентацыі, пабудаваных на аснове класічнай дэтэрміністкай парадыгмы жорсткага кіравання сацыяльнымі працэсамі, яна ўяўляе сабою мадэль сінергетычнага кіравання працэсам прафесійнага самавызначэння і самарэалізацыі старшакласнікаў і арыентавана на выкарыстанне нелінейных, "мяккіх тэхналогій".

Вынікі даследавання выкарыстоўваюцца ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна, Брэсцкім дзяржаўным інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі, Цэнтры прафесійнага самавызначэння "Прафарыенцір" пры Брэсцкім дзяржаўным універсітэце, ліцэях і гімназіях Брэсцкай вобласці.

Вынікі работы могуць быць выкарыстаны для вырашэння тэарэтычных праблем псіхолага-педагагічнай навукі – стварэння новай Канцэпцыі прафесійнага самавызначэння ў агу-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

льнаадукацыйнай школе Рэспублікі Беларусь, а таксама аптымізацыі працэсаў самавызначэння і самарэалізацыі старшакласнікаў.

Укараненне ў адукацыйны працэс мадэлі, канцэптуальных палажэнняў і вывадаў даследавання дазволіць дасягнуць сацыяльна значнага практычнага выніку – стварыць умовы для станаўлення асобы, гатовай прыняць "выклік будучыні", пабудаваць праект уласнага прафесійнага жыцця і авалодаць спосабамі яго здзяйснення.

**Abstract.** In the paper a model of achieving vital professional self-realization which assists the realization of personal needs by dint of raising aims and defining priorities is proposed. It takes into account the responsibility for results, decreases negative stress results of staying in the point of bifurcation by means of keeping balance of social role. Using synergy of remote, medium and close perspectives, personal growth, giving orders to life by dint of time-planning and self-management skills, adaptation to the changing conditions of life are also considered.

**Літаратура**

1 Абульханова-Славская, К.А. Стратегия жизни / К.А. Абульханова-Славская. – М. : Мысль, 1991. – 229 с.

2 Гинзбург, М.Р. Психология личностного самоопределения : дис. …д-ра психол. наук : 19.00.13 / М.Р. Гинзбург. – М., 1996. – 205 л.

3 Рубинштейн, С.Л. Проблемы общей психологии / С.Л. Рубинштейн. – М. : Педагогика, 1976. – 416 с.

4 Франкл, В.Э. Человек в поисках смысла: / В.Э. Франкл ; [пер. с англ. и нем.] / общ. ред. Л.Я. Гозмана, Д.А. Леонтьева. – М. : Прогресс, 1990. – 367 с.

Брестский государственный
университет им. А. С. Пушкина

Поступило 9.03.09

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ